уласна «барадулінскага»). Паэт паказвае, што на шляху да большай раскаванасці верша, да гутарковасці, магчымасці сілаба-танічнай сістэмы яшчэ далёка не вычарпаныя. Ён узбагачае традыцыйны верш новымі прыёмамі, дэманструючы, што наватарства і традыцыя могуць існаваць поруч.

ЛІТАРАТУРА

Барадулін Р. Міласэрнасць плахі: Кніга паэзіі. Мн., 1992.
Барадулін Р. Евангелле ад Мамы: Кніга паэзіі. Мн., 1995.
Гаспаров М.Л. Современный русский стих: Метрика и ритмика. М., 1974.
Рагойша В.П. Паэтычны слоўнік. Мн., 1987.
Ралько І.Д. Верш і мова: Праблемы тэорыі і гісторыі беларускага верша. Мн., 1986.

*Дуброўскі Аляксандр Уладзіміравіч* – аспірант кафедры тэорыі літаратуры БДУ, магістр гуманітарных навук. Навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар В.П. Рагойша.

*Г.М. ДРУК*

## МІФАТВОРЧАСЦЬ ЯК ІДЭЯСТВАРАЛЬНАЯ АСНОВА Ў ПРОЗЕ ВІКТАРА КАЗЬКО І ЧЫНГІЗА АЙТМАТАВА

The problem of mythocreation, its concept and importance for new artistic reality are analysed in this article. The analysis is based on the prosaic works of writes V. Kozko and Ch. Aitmatov. The general folk-mythological images and motivesare. The peculiarities of their interpretation in the prose are revealed too. The emphasis is made on the use of the myth and legend in literary works as an expressive means of important ideas of human life.

Праблема міфалагізацыі – адна з самых важных і актуальных у сучасным літаратуразнаўстве. Літаратурная міфатворчасць – гэта сродак мастацкага засваення рэчаіснасці, сутнасць якога, на думку В. Каваленкі (гл. падрабязней Каваленка 1981), заключаецца ва ўменні мастака бачыць паэзію ў простым і будзённым, ствараць са звычайнага нешта таямнічае і загадкавае, адухаўляць рэчаіснасць. Іншымі словамі, спецыфічнай асаблівасцю фальклорна-міфалагічнага асэнсавання свету ў літаратуры з'яўляецца яго паэтызацыя, моцнае ўнутранае выяўленне пачуццёвага перажывання. Па прычыне таго, што міф – "максімальна абагулены вопыт" (Шамякіна 1993, 49) чалавецтва, то ва ўсе часы ён застаецца крыніцай, якая жывіць творчую фантазію. Старажытны светапогляд уплываў на ідэйна-тэматычны змест, вобразную сістэму, паэтычныя сродкі фальклорных твораў. На язычніцкіх рэлігіях вырастала хрысціянства, якое ўбірала ў сябе распрацаваныя імі ідэі, але прыстасоўвала іх да запатрабаванняў свайго часу. Біблія – таксама збор міфаў, у якіх разуменне светабудовы асэнсоўваецца на больш высокім узроўні абагульнення.

Міф – адна з асноў літаратурнай творчасці. З большым або меншым поспехам да фальклорна-міфалагічных вытокаў звярталіся амаль усе прадстаўнікі беларускай літаратуры. Так, адметнай асаблівасцю аўтарскага светабачання ў "Слове аб палку Ігаравым" ёсць анімістычнае ўспрыманне прыроды. Багаты змест Бібліі дае матэрыял для роздумаў Ф. Скарыне. У XIX ст. з'яўляецца своеасаблівы стылёвы накірунак: "фальклорна-міфалагічны" (В. Каваленка), або "рамантычна-этнаграфічны" (М. Грынчук). Яго закладвалі сваёй творчасцю В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Чачот, Я. Баршчэўскі і інш. І калі для іх фальклор і міфалогія часта яшчэ толькі плод засваення, то ў творчасці пісьменнікаў пачатку XX ст. (Я. Купалы, М. Багдановіча, Я. Коласа, М. Гарэцкага) гэта "ўжо цалкам мастацкае адкрыццё на народным" (гл. Узроўні фальклорных уплываў 1982, 60). Найбольш грунтоўным і цэласным даследаваннем сувязей міфалогіі і беларускай мастацкай творчасці з'яўляецца манаграфія В. Каваленкі "Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры" (1981). Вызначэнню ролі народна-паэтычнай спадчыны ў творах нацыянальных пісьменнікаў прысвечаны і іншыя манаграфіі і артыкулы (гл. падрабязней Грынчык 1969; Тарасюк 1985; Чабан, Гарадніцкі 1988; Конан 1994; Конан 1997).



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Вялікай цікавасцю да міфа пазначана XX ст. Даследчыкамі заўважана, што зараз найбольш папулярная ў свеце творчасць пісьменнікаў, для якіх уласціва стварэнне ўласных міфапаэтычных сімвалаў (Т. Ман, Г. Маркес, А. Маравія і інш.). У гэтым плане нашу ўвагу прыцягваюць перш за ўсё дзве літаратурныя постаці – Ч. Айтматаў і В. Казько, чые раманы "Буранны паўстанак" і "Хроніка дзетдомаўскага саду" з'яўляюцца яркімі ўзорамі міфатворчасці. Паспрабуем высветліць значэнне і мастацкую функцыянальнасць фалькпорна-міфалагічных вобразаў і матываў у гэтых творах: Саду, зерня, Залатога Ключыка, палявання, зубра.

Характэрная асаблівасць многіх літаратурных твораў у XX ст. – стварэнне ў іх вобраза "чалавека-звера", або "псеўдачалавека" (напрыклад, Шарыкаў М. Булгакава, манкурты Ч. Айтматава, Янот у В. Казько). Сутнасць гэтых істот, прычыны ўзнікнення "новай пароды" людзей знаходзяцца ў цэнтры мастацка-філасофскага асэнсавання Ч. Айтматава. Ідэяставральнай у яго рамане "Буранны паўстанак" з'яўляецца легенда пра памяць. У ёй апавядаецца пра самае неймавернае па жорсткасці злачынства ва ўсім свеце. Заваёўніцкія плямёны жуаньжуанаў паланілі маладых хлопцаў і ператваралі іх у асаблівых рабоў, якіх называлі манкуртамі. Варварскае племя імкнулася знішчыць у чалавеку памяць – не тую натуральна-прыродную, якую мае ўсё жывое, а памяць гістарычную, сацыяльна-культурную. Вядома, што жывёлы ўспрымаюць і перажываюць мнагастайныя працэсы жыцця, мінулае іх роду кадзіруецца ў структуры інстынктаў. Мінулае чалавека, у адрозненне ад іх, караніцца ў вопыце гістарычным, які перадаецца з пакалення ў пакаленне і фіксуецца ў чалавечай памяці. Манкуртамі становяцца тыя, хто не ведае свайго імя, родных каранёў, не ўсведамляе сябе Чалавекам. У той жа час прададзеных жуаньжуанамі ў рабства лічылі шчаслівымі, бо яны былі вольныя хоць у выбары сваіх думак і намераў, а пры выпадку маглі збегчы. І ўсё ж легенда сцвярджае, што без усведамлення чалавекам самога сябе, без культурна-гістарычнай памяці няма і не можа быць самасцвярджэння асобы, духоўнага пачатку ў ёй, пачуцця маральнай годнасці і незалежнасці. "Калі чалавек не зможа ўявіць сябе хоць патаемна Богам, што заступаецца за ўсіх, а значыць, і за яго, чалавека, дык і цябе, Божа, не стане..." (цыт. па.: Айтматаў 1987, 221). У гэтых разважаннях Едыгей сцвярджае простую ісціну: прызнанне "я" тоесным самому сабе азначае прыняцце самасвядомым індывідам адказнасці за ўласныя ўчынкі і думкі. У такім выпадку захоўваецца першапачаткова закладзены ў чалавеку індывідуальна-асабовы пачатак, што і спрыяе ўдасканаленню ўнутранай культуры, узрастанню значнасці свайго "я". Знішчэнне ж духоўнасці і пачуцця самапавагі – шлях да смерці фізічнай.

Легенда як фальклорны жанр – не толькі выдумка, але яна вызначаецца глыбокім веданнем жыцця. Доказам таму створаны Ч. Айтматавым вобраз рэальнага манкурта – Сабітжана. Самазадаволенасць, сытасць прывялі яго да такой атупеласці душы, што нават смерць бацькі не выклікае ў яго чалавечых пачуццяў. Герой ужо даўно апынуўся на шляху маральнай дэградацыі і гістарычнага самазабыцця. Едыгей гаворыць пра Сабітжана: "Ведаць ён усё ведае, а нікчэмны, як ёсць нікчэмны" (цыт. па.: Айтматаў 1987, 113). Трапіць на гэты згубны шлях асобнаму чалавеку і народу можна па некалькіх прычынах. Па-першае, да яго вядзе пастаянная хлусня, якая стварае прывіднае, уяўнае адчуванне спакою; па-другое, сытая самазадаволенасць у жыцці размагнічвае чалавека, а добра вядома, што творчыя здольнасці, як правіла, рэалізуюцца толькі праз цяжкасці, перашкоды. Па-трэцяе, засеў у душы сумнення, разладу, падзел на сваіх і чужых; па-чацвёртае, знішчэнне маральнай асновы чалавека. Ч. Айтматаў падказвае чытачам: толькі сям'я ў першую чаргу здольна прывіць дзіцяці духоўныя каштоўнасці праз захаванне спаконвечных традыцый, найперш – праз далучэнне да народных казак і легенд. Амерыканскі псіхолаг і псіхіятр Б. Батэльгейм, да-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

следуючы казкі ў псіхааналітычным рэчышчы, робіць назіранне, што ў дзіцячыя гады адбываецца інтэнсіўнае фарміраванне "Я" чалавечай асобы, на якую эмацыянальна моцна ўздзейнічае казка. Яна будзіць фантазію, спрыяе закладванню маральных установак. Вяртанне да казкі ў сучаснай літаратуры, а гэта значыць міфапаэтычнага ў сваёй аснове светаадчування, бачыцца спробай вяртання да першавытокаў народнай мудрасці, чалавечай дабрыні, адухоўленага паэтычнага кантакгавання чалавека з навакольным светам. Беларускі празаік выдатна разумее важнасць і неабходнасць сустрэчы з казкай і дзяцінствам. На думку пісьменніка, дзяцінства – тая жыватворная крыніца, якая ачышчае душу чалавека ад жыццёвага бруду, звыкласці існавання, змывае ўсё наноснае, зачарсцвелае. Падарожжа ў краіну маленства неабходна для таго, каб душа нязменна заставалася ўражлівай, трапяткой і чуйнай да праяў навакольнага свету. У гэтым пераконвае гісторыя з рамана пра тое, як дзетдомаўцы вырашылі аднойчы завалодаць Залатым Ключыкам. З дапамогай уключэння ў структуру мастацкага тэксту фальклорнага вобраза аўтар даводзіць, як дарослым не хапае адной, вельмі важнай для іх якасці: веры ў дзіва, чакання цуду. Не мае яе і Сабітжан, таму што здрадзіў свайму дзяцінству, забыў пра яго.

В. Казько, у адрозненне ад Ч. Айтматава, сам стварае легенду, якая дапамагае выявіць сутнасць чалавека-звера па імені Янот. Для гэтай легенды аўтар запазычыў з міфалогіі толькі вобразы і матывы як аснову для ўласнай ідэйна-сэнсавай інтэрпрэтацыі рэчаіснасці. Вобраз зубра Сноўдалы сімвалізуе ўзнаўленне парушанай сувязі эпох, ён здольны злучыць мінулае і сучаснае, вандруючы з веку ў век. Аднойчы, заблукаўшы ў сад, ён вырашыў паласавацца яблыкамі. "Першы дзень Сноўдала толькі і рабіў, што еў, і быў рады, на другі – ужо трохі сумаваў, а на трэці ўжо і звыкся з такім жыццём" (цыт. па.: Казько 1987, 325). Праз некалькі дзён ён "забыў сваё імя", а "памяць засталася толькі ў страўніку". Аднак, у адрозненне ад айтматаўскага манкурта, які такім зрабіўся назаўсёды, Сноўдала ў час зразумеў небяспеку, таму і радуецца, што "яго прагналі з саду, не далі сытасцю затлуміць галаву". Як бачым, думка праводзіцца тая ж: сытасць і бестурботнасць жыцця, звычка аддаваць перавагу прыродна-фізіялагічным інстынктам прытупляюць пачуццёвасць успрымання свету, знішчаюць памяць. Так і нараджаюцца новыя істоты, толькі знешне падобныя да чалавека, бо ўнутры ў іх – духоўная пустата. У новым абліччы яны самі становяцца паляўнічымі, як у рамане В. Казько, ці бяздумнымі іх служкамі, як у творы Ч. Айтматава. Пісьменнікі асэнсоўваюць матыў адвечнага палявання, аб'ектам якога ў рамане "Буранны паўстанак" выступае не толькі памяць, але і асабовасць, індывідуальная непаўторнасць чалавека. Легенда пра Раймалы-агу – паэтычны твор пра незвычайна чыстае пачуццё кахання як стваральную сілу, а таксама пра тых, хто робіць замах на свабоду творчай асобы.

У В. Казько паляванне ідзе за Сноўдалам, вобраз якога шматзначны. Зубр сімвалізуе адвечную непарыўную еднасць з прыродай (у яго некалі было адно імя з чалавекам). "Вялікім пакутнікам і неўтаймаванцам" называе Сноўдалу адзін з беларускіх крытыкаў (Марціновіч 1986, 5). Неўтаймаванасць, трывога, нястомнасць пошукаў – прыкметы духу. Душэўны неспакой ніколі не зробіць чалавека раўнадушным. Значыць, мэта палявання – знішчыць чалавечнасць, здольнасць адчуваць сябе спалучаным з прыродай і роднай зямлёй. В. Казько працягвае літаратурную традыцыю паказваць забойства зубра як знішчэнне нечага высокага і прыгожага. Напрыклад, у "Песні пра зубра" М. Гусоўскага гэты вобраз – увасабленне славы і магутнасці беларускай зямлі. Засталося неразгаданым яшчэ адно: што шукае зубр, раз-пораз вяртаючыся ў глыбіні стагоддзяў? Што азначае сустрэча з ім? Зразумець дапаможа адна з міфалагічных канцэпцый, паводле якой у архаічнага чалавека існавала патрэба перыядычнага вяртання праз рытуал да першапачатку з мэтай паўтарэння акта касмагоніі, які азначаў перамогу



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Космасу над Хаосам, упарадкаванне свету, устанаўленне гармоніі, суладдзя (гл. падрабязней Элиаде 1988). Зубр шукае... Сад.

Рэальны вобраз саду вырастае да сімвала, які мае, на наш погляд, некалькі значэнняў. Выкарыстаўшы біблейскі міф пра эдэмскі сад, аўтар пакінуў толькі першапачаткова замацаванае за міфалагічнымі вобразамі ўяўленне. Так, яблыкі ў садзе выступаюць спакусай для зубра, а сад у значэнні "раю" бачыць, напэўна, адзін Уладзік Саліла. Вечным садам называе ён родную зямлю за яе незвычайную прыгажосць і экзотыку. Для Трубецкага сад звязваецца з магчымасцю пакінуць пра сябе памяць сярод людзей. Для міфалагічнай свядомасці характэрна ўяўленне пра дрэва як пра часавапрасторавую мадэль свету (гл. Шамякіна 1994). Яно аб'ядноўвае свет па гарызанталі, вертыкалі і ў часавых адносінах, таму выступае як увасабленне памяці пра мінулае, вобраз самой вечнасці. Адсюль матыў пасадкі дрэва як сімвала ўсвядомленай бессмяротнасці. "Дрэва – адно з самых высакародных стварэнняў Маці-Прыроды, якая гэтым як бы падказвае пажаданую форму чалавечай душы: форму, якая дазваляе, трывала трымаючыся за зямлю (абавязкова родную), смела ўздымацца ў неба" (Шамякіна 1994, 52). Аўтар так настойліва дазваляе саду адраджацца на старонках рамана, таму што звязвае з ім асаблівы стан душы, калі чалавек імкнецца да гармоніі, ідэалу, дасканаласці.

Сцежку ў Сад знайсці не проста. Яе падказвае казка пра зубра. Дасягнуць адчування "раю" можна толькі пры сваёй непадзельнасці з прыродай, роднай зямлёй і прызнанні жыццёвага і духоўнага вопыту мінулых пакаленняў. Дзедка дае наказ свайму ўнуку дачакацца зубра. Ён і сам прагне сустрэць Сноўдалу перад смерцю, каб яшчэ раз пераканацца, што змог праз казачнае апавяданне пасеяць у душы Мар'яна зерне дабрыні і памяці, перадаць свой духоўны вопыт. У гэтым засеве была зарука будучыні, і толькі пасля яго мог са спакойнай душой пайсці стары чалавек на вечны спачын. Такое зерне – элітнае, адрознае ад таго, якім засявалі душэўнае поле Сабітжана.

Такім чынам, міфатворчасць і яе мастацкая функцыянальнасць у прозе Ч. Айтматава і В. Казько маюць тыпалагічнае падабенства. Уплеценыя ў тэкставую структуру і сістэму аўтарскага мыслення міфалагічныя вобразы ў беларускага пісьменніка сведчаць пра арыгінальнасць яго думкі і погляду на свет. Міфапаэтыка ў раманах В. Казько і Ч. Айтматава становіцца важным ідэйна-канцэптуальным сродкам творчага працэсу. Абодва празаікі гавораць пра неабходнасць мацавання духоўнай повязі з прыродай і родным краем, нагадваюць пра тое, як важна захаваць у сабе гістарычную памяць, каб набыць павагу ў сучасным цывілізаваным свеце.

### ЛІТАРАТУРА

Айтматаў Ч. Буранны паўстанак: І вякуе дзень даўжэй за век / Пер. з рус. М. Стральцова. Мн., 1987.

Грынчык М. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі. Мн., 1985.

Каваленка В. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. Мн., 1981.

Казько В. Хроніка дзетдомаўскага саду. Мн., 1987.

Конан У. Міфічныя вобразы і матывы ў паэзіі М. Багдановіча // Роднае слова. 1994. № 4. С. 51–55.

Конан У. У містычных сферах быцця // Полымя. 1997. № 3. С. 261–271.

Марціновіч А. Галінка з дрэва вечнасці // ЛіМ. 1986. 17 кастр. С. 5.

Тарасюк Л. Вернасць вытокам: Фальклорныя традыцыі ў сучаснай беларускай паэзіі. Мн., 1985.

Чабан Т., Гарадніцкі Я. Сучасная паэзія і фальклор. Мн., 1988.

Шамякіна Т. Мадэль свету ў міфалагічных сістэмах // Роднае слова. 1994. № 2 С. 49–58.

Шамякіна Т. Міфалогія і яе значэнне // Роднае слова. 1993. № 7. С. 49–53

Элиаде М. Космос и история. М., 1988.

Яскевіч А. Узроўні фальклорных уплываў // Узроўні фальклорных уплываў: Зборнік / Рэд. У.В. Гніламёдаў, К.А. Цвірка. Мн., 1982.

***Друк Галіна Мацвееўна*** – аспірант кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя БДУ
Навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар А.І. Бельскі.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm